# Кіраўнік гурта, фестываляў і каранацый

Алег Хаменка – заснавальнік беларускага фольк-рока, лідар легендарнага гурта "Палац". Упэўненая моц і вера ў сябе спалучаюцца ў ім са спакоем, **мяккасцю, памяркоўнасцю. Унутранымі рысамі - талерантнасцю, інтэлігентнасцю - ён нагадвае Уладзіміра Мулявіна. Ці можна уявіць сабе Алега, які размаўляе не на роднай мове? Акрамя працы ў гурце, Алег цудоўна спраўляецца з роляй тэле- і радыёвядоўцы, крытыка, выкладчыка.**

Гурт "Палац" пад яго нязменным кіраўніцтвам браў удзел у фестывалях у Заходняй Еўропе і ў краінах СНД. У 1993 годзе " Палац" патрапіў у дзесятку лепшых калектываў Усходняй Еўропы па выніках фестывалю РадыёФранс Інтэрнасьяналь. Атрымліваў узнагароды і прэміі на фестывалях "Славянскі базар", "Маладзечна 1995-2001", "Азія-Даўсы (Казахстан), "Басовішча 1995-2000" (Польшча), "Суклегас" (Літва), Рок-каранацыя 1995-2000, Казачы круг 2001, Краіна Мрыі 2004 (Украіна). Шматгалосныя спевы, спалучэнне розных народных інструментаў, смелае выкарыстанне магчымасцяў сучасных сінтэзатараў вызначаюць яго стылістыку. За 18 гадоў, што існуе гурт, з яго выйшлі ў сольнае плаванне многія музыкі.

***- Спадар, Алег, раскажыце, калі ласка, крышачку пра сябе.***

- Нарадзіўся ў красавіку 1967 ў Менску. Вучыўся ў агульнаадукацыйных "чыжоўскіх" школах: № 117 - да сёмага класа, і № 43 - з сёмага па дзесяты, ды ў бліжэйшай музычнай, №2, па класу трамбона. У 1990-тым годзе я закончыў БДУКІМ па спецыяльнасці "культуролаг", ў 2007 - аспірантуру. Хацелася зменшыць колькасць белых плямаў на прасторы беларускай культуры. Грунтоўная тэарэтычная адукацыя абавязвае мяне перадаваць свае веды. Выкладаю тэхналогію прадзюсарскай дзейнасці ў сферы мастацтва на кафедры Менеджменту сацыяльна–культурнай дзейнасці БДУКІМ. Перадаю досвед юнакам, хто пачынае гэты шлях.

У беларускіх музыкаў ёсць свае стратэгія. Вывучаеш спачатку тое, што зроблена папярэднікамі ў гэтай сферы, назапашваеш свой досвед, потым спрабуеш яго асэнсаваць. Цяпер ужо час асэнсоўваць.

Працу ў "Палацы" мы пачыналі ў 1992 годзе з асяроддзя маладых прафесійных музыкаў, якія мелі густ і адчуванне розных музычных стыляў. Асновай для нашага аб'яднання быў беларускі аўтэнтычны фальклор, які выконваўся музыкамі, як ў арыгінальным гучанні, так і ў стылёвых апрацоўках.

І па сённяшні дзень у складзе гурта акрамя вядомых музычных інструментаў (саксафон, гітара, труба, акардэон, сінтэзатары) удзельнічаюць і традыцыйныя аўтэнтычныя беларускія інструменты: лера, дуда, жалейка, дудка, сурмы. У творчасці гурт выкарыстоўвае матэрыял, сабраны ў фальклорных экспедыцыях.

Напачатку нашай дзейнасці з дзесяці песень дзве былі аўтарскімі, іншыя -на матывах беларускіх фальклорных песень і абрадаў, цяпер - напалову. У будучыні думаем, што суадносіны будуць 80/20 адсоткаў адпаведна аўтарскіх і фальклорных песень. Мае кампазіцыі таксама не ў баку, бо і я - частка народа, я - частка гэтага кола.

***- Улетку Вы былі мастацкім кіраўніком фестывалю "BelaMusik-2009", які праходзіў на пляцоўцы аэраклуба "Баравая" над Менскам". Якія ўражанні засталіся пасля гэтага свята?***

-Вельмі адчувальны недахоп "фестывалю фестываляў", дзе маглі б сабрацца героі ўсіх музычных прэміяў, узнагародаў, цырымоніяў, што праводзяцца на Беларусі." Рок кола" і " Рок –каранацыя" ладзяцца ў канцэртных залах, а "Басовішча"- за межамі Беларусі".

Жывы гук на адкрытым паветры - гэта больш натуральная форма існавання актуальнай музыкі.

**У старадаўнія часы, калі свята ў беларусаў было вялікім, музыкі выходзілі з палацаў і сядзіб на вуліцу, да людзей, да натуральнага ландшафту.**



Мы запрасілі на фестываль сапраўдных зорак - "J: Морс", "Краму", " Дзеці дзяцей","Гарадская", " Без білета" і інш. Гуртоў багата, а музычнай індустрыі ўвогуле бракуе, ды і музычнага бізнесу таксама. Але калі зараз нічога не рабіць, то і спадзявання на гэты конт не будзе. "BelaMusik" мусіць звярнуць на гэта ўвагу.

***- На гэтым тыдні адбылася 14-тая ў гісторыі найноўшай беларускай музыкі рок-каранацыя. Якія вынікі гэтай падзеі?***

- Рок-каранацыя прайшла добра, хаця ўвесь вечар прыйшлося моцна гукаць у мікрафон. У ліку першых карону атрымалі "Без білета". Мы думаем, што гэтым хлопцам зараз патрэбна падтрымка больш, чым іншым калектывам, каб лепей развівацца і самаўдасканальвацца. Адзначаныя каронамі таксама былі "Ляпіс Трубяцкі", "Крама", "Open Space", "The Toobs", Зміцер Вайцюшкевіч і іншыя.

***- Ці ёсць у Вас іншыя захапленні ў жыцці па-за прафесійнай дзенасцю?***

- Я даўні прыхільнік гандболу, більярду і аўтаспорту. Не фанат, але імкнуся сачыць за спаборніцтвамі.

***Гутарыла Э. Дзвінская.***

***На здымку:*** *Алег Хаменка, фота аўтара.*

***Заснавальнік:***
ТБМ імя Францішка Скарыны.
***Пасведчанне аб рэгістрацыі:***
№ 83 ад 27 сакавіка 2007 г.
***Адрас рэдакцыі:***
231293, Лідскі р-н, в. Даліна.
***Адрас для паштовых адпраўленняў:***
231282, г. Ліда-2, п/с 7.
***E-mail:*** naszaslowa@tut.by
http://tbmlida.byhost.org

***Рэдактар Ст***

***Рэдакцыйная калегія.***
Людміла Дзіцэвіч, Вольга Іпатава, Ірына Марачкіна, Леакадзія Мілаш, Алесь Петрашкевіч, Людміла Піскун, Аляксей Пяткевіч, Уладзімір Содаль, Станіслаў Суднік, Павел Сцяцко, Алег Трусаў.